УДК 373.3.016:821.161.3.09

***Л.В. Базылева***
(ДУА «Сярэдняя школа № 41 г. Магілёва»)

# ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКІХ КАМПЕТЭНЦЫЙ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

*Артыкул прызначаецца для фарміравання чытацкіх уменняў на беларускай мове. Дапамагае настаўніку вырашаць задачы па развіцці ключавых кампетэнцый вучняў.*

У сучасным хутказмяняючым свеце чалавек вымушаны вучыцца на працягу ўсяго жыцця. Адной з умоў паспяховай самаадукацыі з'яўляецца сфарміраванасць ключавых кампетэнцый. Галоўныя месца ў пераліку ключавых кампетэнцый займае чытацкая кампетэнцыя. Чытацкая кампетэнцыя вызначаецца



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

валоданнем тэхнікай чытання, прыемамі разумення прачытаннага і праслуханнага твора, веданнем кніг і ўменнем іх самастойна выбіраць, сфарміраванасцю духоўнай патрэбы ў кнізе і чытанні.

Паказчыкамі чытацкай цікавасці малодшых школьнікаў з'яўляецца:

• станоўчае стаўленне да самой чытацкай дзейнасці («люблю чытаць»);

• зацікаўленнасць канкрэтнымі кнігамі («хачу гэтыя кнігі»);

• захапленне самім працэсам чытання («не магу адарвацца ад кнігі»)

• імкненне падзяліцца з іншымі радасцю ад зносін з кнігай («хачу каб іншыя аб гэтай кнізе даведаліся»).

Фарміраванне чытацкай кампетэнцыі навучэнцаў адбываецца на ўроках літаратурнага чытання, пазакласнага чытання, на пазакласных занятках праз арганізацыю літаратурных гульняў, творчых конкурсаў, заняткаў з элементам тэатралізацыі, што стымулюе творчасць дзяцей.

Першы крок на шляху прылучэння дзяцей да чытання павінен быць накіраваны на авалоданне тэхнікай фарміравання чытання і, перш за ўсе, на запамінанне вучнямі літар, своеасаблівасці іх спалучэнняў, на фарміраванне ўменняў хутка адрозніваць пэўную літару сярод іншых, суадносіць яе з гукам, пазнаваць, што яна азначае, калі аказваецца ў ланцужку іншых літар, якія ўтвараюць слова.

Навучэнцы пачынаюць прайграваць гукавую форму слова, развіваецца навык плаўнага складовага чытання, чытаюцца складовыя канструкцыі, словы, словазлучэнні, сказы і тэксты. Так, у выніку сістэматычнай і мэтанакіраванай працы адбываецца фарміраванне навыку чытання. Пад навыкам чытання маюць на ўвазе: уменне правільна прачытваць словы; разумець сэнс тэксту; выразна чытаць; вытрымліваць аптымальны тэмп чытання.

Мэтай вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца закладанне ў вучняў асновы культурнага чытача, які ўсведамляе каштоўнасць літаратуры як мастацтва слова, можа ажыццяўляць самастойную чытацкую дзейнасць па асобным успрыманні і асэнсаванні адпаведных узросту твораў мастацкай літаратуры.

Для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні літаратурнаму чытанню на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вызначаны і вырашаюцца задачы па фарміраванні і развіцці ключавых кампетэнцый вучняў.

1. Сацыякультурнай кампетэнцыі:

• прывучаць вучняў да паслядоўнага выканання культурных норм;

• актывізаваць пазнавальныя памкненні вучняў у спасціжэнні беларускай нацыянальный культуры, захаванні нацыянальна-культурных традыцый.

2. Асобаснай кампетэнцыі:

• гарманічна фарміраваць навык чытання, комплекс чытацкіх уменняў, якія забяспечаць асэнсаванае ўспрыманне, поўнае, глыбокае разуменне і асобасную ацэнку маральнай праблематыкі і эстэтычнага плана твора;

• стымуляваць імкненне да чытання кніг на беларускай мове;

• выхоўваць павагу да кнігі як крыніцы самапазнання і развіцця.

3. Маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі:

• развіваць вобразнае ўяўленне, маўленчую актыўнасць,здольнасць да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры;

• фарміраваць агульнавучэбныя ўменні працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў.

З улікам вызначанных задач, змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» павінен быць скіраваны на фарміраванне прыкладных аспектаў чытацкай кампетэнцыі вучняў на беларускай мове:

• навыкаў чытання на беларускай мове (здольнасць правільна «агучваць» графічна зафіксаваны тэкст з разуменнем яго зместу);

• прадуктыўнай чытацкай дзейнасці з тэкстам, кнігай на аснове комплексу бібліятэчна-бібліяграфічных уменняў.

Чытацкая дзейнасць, фарміраванне якой адбываецца на ўроках літаратурнага чытання, з'яўляецца кампанентам (элементам) камунікатыўнай кампетэнцыі і забяспечвае апасродкаваную камунікацыю праз пісьмовы тэкст.

Для эфектыўнага выконвання камунікатыўна-моўнай, чытацкай і літаратурна-мастацкай дзейнасці на ўроках літаратурнага чытання стараюся рашаць дадзеную праблему комплексна: прымяняю розныя формы арганізацыі навучання. А каб у дзяцей было жаданне гаварыць на роднай мове:

• прымаю любыя адказы дзяцей;

• забяспечваю самастойнасць выбару і прыняцця рашэння школьнікамі;

• канстатую памылкі дзяцей як нечаканы погляд на нешта звыклае;

• выключаю крытыку асобы і адмоўную ацэнку дзейнасці школьнікаў;

• абапіраюся на паўсядзённы вопыт дзяцей.

Для развіцця сацыякультурнай кампетэнцыі выкарыстоўваю жанры вуснай народнай творчасці: прымаўкі, прыказкі, загадкі, чыстагаворкі, скорагаворкі, лічылкі, пацешкі, жарты, якія ўжываю на розных этапах урока: моўнай размінцы, пры вызначэнні і замацаванні тэмы, пры падвядзенні вынікаў. У кантэксце культуралагічнага падыхода стымулюецца пазнавальная актыўнасць у вучняў у спасціжэнні гістарычных вобразна-мастацкіх звестак пра Беларусь, яе прыроду, традыцыі, побыт, міфалогію.

Прыказкі і прымаўкі здольны забяспечыць фарміраванне ў вучняў элементаў ключавых кампетэнцый, неабходных для выкарыстання вынікаў навучання ў сацыяльным жыцці асобы, яе развіцця і сацыяльнай адаптацыі.

Вялікую ролю ў развіцці маўлення і папаўнення лексічнага запасу вучняў, іх інтэлектуальнага развіц-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ця адыгрываюць розныя віды загадак: паліндромы (словы, якія чытаюцца як злева направа, так і справа налева); акразагадкі (гэта вершы, у якіх пачатковыя літары вершаваных радкоў, прачытаныя зверху ўніз, утвараюць слова –адгадку); загадкі – метаграмы, у якіх з задуманага слова шляхам замены адной літары іншай атрымліваецца новае слова; анаграмы – словы, якія атрымліваюцца ў выніку перастаноўкі літар у слове; лагагрыфы – словы-загадкі, якія змяняюць сваё значэнне пры адыманні або дадаванні літар.

Для эфектыўнага выконвання літаратурна-мастацкай дзейнасці я ў сваёй працы карыстаюся нестандартнымі прыёмамі работы, накіраванымі на развіццё сацыякультурнай, асобаснай і маўленча-камунікатыўнай кампетэнцый пры рабоце з творамі розных жанраў:

- змяненне канцоўкі твора;
- змена сітуацый у творы, з якім пазнаёміліся;
- метад «Новы погляд» (героі надзяляюцца іншымі якасцямі);
- рэклама твора.

Вельмі карысным лічу работу па складанні сваіх уласных апавяданняў:

- «Заканчваем твор»;
- «Інцэніроўка твора»;
- «Тэатр-экспромт» (калі адзін вучань распавядае, а другі з дапамогай жэстаў і мімікі абыгрывае сітуацыю);
- «Выратавальныя сітуацыі ў творах» (прыдумванне канцовак).

Пры рабоце над мастацкім творам выкарыстоўваю наступныя заданні:

- складзі апавяданне ад імя героя;
- складзі дыялог розных герояў;
- апісаць адну і тую ж сітуацыю, прадмет з пункту гледжання розных яе ўдзельнікаў, інтарэсы якіх могуць быць і процілеглымі.

Для фарміравання чытацкіх уменняў выкарыстоўваю такія практыкаванні:

- чытанне з прыпынкамі (вучні знаёмяцца з падзеленым на фрагменты творам павольна, пастаянна вяртаюцца да папярэдняй інфармацыі, аналізуюць яе, параўноўваюць з асабістым досведам);
- «Маланка» (чаргаванне розных відаў чытання);
- «Буксір» (дзеці ўпаўголаса чытаюць разам са мною альбо з добра чытаючым вучнем);
- «Фініш» (знайсці адказ на пастаўленае перад пачаткам чытання тэксту пытанне);
- «Чырвоны святлафор» (падчас чытання я спецыяльна замяняю адно слова іншым, а дзеці павінны заўважыць памылку).

Неацэнную дапамогу ў развіцці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў аказвае далучэнне іх да даследчай дзейнасці. У выніку вучэбна-даследчай работы яны набываюць бясцэнны вопыт самастойнай творчай дзейнасці па засваенні новых ведаў, вучацца адказваць на пытанні рознага характару, ставіць іх, весці дыялог, сцісла пераказваць тэкст, будаваць звязныя выказванні, выконваць асноўныя віды пісьмовых работ, што ў сукупнасці развівае вусную і пісьмовую мову навучэнцаў.

Стратэгія фарміравання чытацкіх кампетэнцый патрабуе сістэматычнага падыходу, ад яе выніку залежыць будучае нашай краіны. Чалавек, які не валодае чытаннем як інтэлектуальнай тэхналогіяй, не можа адпавядаць патрабаванням сучаснага рынку працы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Каплев, С. С. Технология интерактивного обучения/ С. С. Каплев. – Минск : Белорусский верасень, 2005. – 196 с.
2. Неборская, Т. В. Литературное чтение: игры, конкурсы, викторины, кроссворды, праздники / Т. А. Неборская, Е. Л. Загурская. – Минск : Аверсэв, 2009. – 606 с.
3. Учебная программа по учебным предметам для учреждений ощего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. – Минск : ОАО “Промпечать”, 2017. – 205 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова